ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 149 (1116) | НЯДЗЕЛЯ, 29-га чэрвеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

XVI-ты ЗЬЕЗД УсеКП(б)

ПАД СЬЦЯГАМ ЛЕНІНІЗМУ МЫ ПЕРАМОЖАМ!

ТЭМПАМІ РАЗЬВІЦЬЦЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ МЫ НАГАНЯЕМ ПЕРАДАВЫЯ КАПІТАЛІСТЫЧНЫЯ КРАІНЫ

Наша задача:—ДАГНАЦЬ, бо не дагнаць, значыць загінуць

(Кароткі зьмест дакладу т. Сталіна)

Тав. Сталін пачаў свой даклад з паказаньня, што пэрыод, прайшоўшы з часу ХУ зьезду, быў пэрыодам пераломy як для СССР, так і для ўсіх капіталістычных краін. Для СССР гэты пералом азначае экономічны ўздым і рост, для капіталістычных краін—экономічны упадак. Даючы вычэрпваючую характарыстыку эканамічнага крызісу капіталістычным краінам, тав. Сталін прыходзіць да вываду, што сучасны сусьветны эканамічны крызіс у капіталістычных краінах зьяўляецца самым сур'ёзным, самым глыбокім з усіх папярэдніх. Рэзка выяўлены крызіс ахоплівае ўсе галіны прамысловасьці капіталістычных краін. Гэты крызіс ёсьць і ў галіне аграрнай. І толькі адна галіна прамысловасьці не перажывае крызісу—галіна ваенная. Спыняючыся на антаганізьме і барацьбе за рынкі паміж імпэрыялістычнымі краінамі, а з другога боку—на супярэчнасьцях паміж імпэрыялістычнымі і калёніяльнымі краінамі, тав. Сталін пераходзіць да аналізу супярэчнасьцяй паміж капіталізмам і пролетарыятам.

Вывады з гэтай часткі дакладу тав. Сталін робіць наступныя: **частковай „стабілізацыі“ капіталізму прыходзіць канец:** экономічны крызіс перарастае у крызіс політычны, капіталістычныя краіны ідуць па шляху далейшай фашызацыі, скарыстоўваючы ў гэтых мэтах усе рэакцыйныя сілы, у тым ліку і соцыял-дэмократыю; буржуазія з гэтага становішча будзе шукаць выхаду ў вайне і інтэрвэнцыі, пролетарыят—у рэволюцыі.

Далей тав. Сталін пераходзіць да ацэнкі адносін паміж капіталістычнымі краінамі і СССР. Гэтую частку свайго дакладу тав. Сталін канчае словамі:—мы праводзілі політыку міру. Гэту політыку міру мы і надалей будзем праводзіць. Ніводнай пядзі чужой зямлі мы ня хочам, і ніводнага вяршка сваёй зямлі мы не аддамо.

Тав. Сталін пераходзіць да другога разьдзелу свайго дакладу—унутранога становішча СССР.

СССР перайначваецца з краіны аграрнай у краіну індустрыяльную.

Гаворачы аб агромністых дасягненьнях у соцыялістычным будаўніцтве дакладчык патрабязна спыняецца на стане народнай гаспадаркі.

Тав. Сталін на падставе даных констатуе нябывалі рост продукцыі і прамысловасьці ў цэлым і рэкордны, у параўнаньні з капіталістычнымі краінамі, рост народнага прыбытку. Рост народнай гаспадаркі ішоў пад знакам нарастаючай індустралізацыі краіны. СССР перайначваецца з краіны аграрнай ў краіну індустрыяльную. Мы няўхільна разьвіваем аснову нашай экономічнай незалежнасьці—цяжкую прамысловасьць.

Узрастае ўдзельная вага соцыялістычнага сэктару, і наадварот—увесь час зьмяншаецца прыватнаўласьніцкі, капіталістычны.

Пытаньне „хто каго“ ў прамысловасьці вырашана канчаткова і безпаваротна на карысьць соцыялістычнай прамысловасьці.

— Тэмпы росту байное прамысловасьці такія,—гаворыць тав. Сталін,—што мы пяцігодку можам выканаць у чатыры гады, па асобных галінах—у тры, альбо ў два гады. Тэмпамі разьвіцьця прамысловасьці мы наганяем перадавыя капіталістычныя краіны, хоць яшчэ адстаем ад гэтых краін у адносінах агульнага ўзроўню разьвіцьця прамысловасьці.

Наша задача—дагнаць—бо не дагнаць, значыць загінуць.

Тэмпы разьвіцьця колгаснага будаўніцтва такія, якіх мы яшчэ ня бачылі ў прамысловасьці

Спыняючыся на стане сельскай гаспадаркі, тав. Сталін гаворыць, што ў цэнтры ўвагі за мінулы пэрыод сталі тры проблемы: збожжавая, жывёлагадоўчая і проблема тэхнічных культур. Збожжавая проблема ў асноўным вырашэна. Мы ўступілі ў паласу вырашэньня жывёлагадоўчай проблемы і інтэнсыўнага разьвіцьця тэхнічных культур. На базе дробнай сялянскай гаспадаркі гэтыя проблемы вырашаць немагчыма. Вырашыць іх можна толькі на базе буйное гаспадаркі, узброенай новай тэхнікай. Аднак, ёсьць два шляхі разьвіцьця буйное сельскае гаспадаркі: кулацкі, гэта значыць капіталістычны, і соцыялістычны. Наш шлях—апошні, г. зн. соцыялістычны. Ідучы па гэтым шляху, мы, не гледзячы на перагібы, галавакружэньне і хіхіканьне правых дабіліся вялізарных посьпехаў. Дакладчык прыводзіць цэлы шэраг наглядных цыфр аб разьвіцьці савгасаў і колгасаў. Гэтыя посьпехі дазваляюць савгасам выканаць сваю пяцігодку ў тры гады, а колгасам — у два гады. Тэмпы разьвіцьця колгаснага будаўніцтва такія, якіх мы яшчэ ня бачылі ў прамысловасьці. За тры гады пасеўная плошча колгасаў вырасла ў 40 раз і роўна ўсёй пасеўнай плошчы Францыі і Італіі разам узятых. К канцу пяцігодкі пад колгаснымі палямі павінна быць 20 мільёнаў гэктараў, але колгасы даюць дзяржаве больш палова ўсёй таварнай продукцыі збожжа. Падрабязна спыняючыся на матар'яльным становішчы працоўных мас, таварыш Сталін гаворыць, што ў выніку ўмацненьня соцыялістычных элемэнтаў у краіне і клясавага прынцыпу пры разьмеркаваньні народнага прыбытку, закладваюцца асновы для няўхільнага палепшаньня матар'яльнага становішча працоўных.



У сувязі з гэтым пытаньнем дакладчык ставіць задачу карэннага палепшаньня работы спажывецкай коопэрацыі.

У галіне культурнага будаўніцтва дакладчык высоўвае задачу найхутчэйшага ажыцьцяўленьня ўсеагульнага пачатковага навучаньня.

Пасьля падрабязнай характарыстыкі цяжкасьцяй нашага росту, росту, а ня ўпадку, што характэрна для капіталістычных краін і што нас адрозьнівае ад гэтых краін, тав. Сталін падкрэсьлівае, што гэтыя цяжкасьці рэконструкцыйнага пэрыоду мы можам перамагчы толькі пры ўмове, калі будзем адбіваць атакі і зломім супраціўленьне клясавых ворагаў. Адсюль задачы:

— Пайсьці ў організаванае наступленьне супроць капіталістычных элемэнтаў нашай краіны па ўсім фронце.

— Ізаляваць ад партыі агэнтаў клясавага ворага—правых опортуністых.

Працягваць наступ на капіталістычныя элемэнты ў нашай краіне па ўсіх франтох і да канца

Далей тав. Сталін гаворыць аб лёсе нэпу, падрабязна спыняючыся на нявернай трактоўцы нэпу з боку троцкістых і правых ухілістых. Адзначаючы ўсю неабгрунтаванасьць правых і „левых“ опортуністых, тав. Сталін робіць агульную ацэнку ўнутранога становішча СССР і намячае чарговыя задачы:

— Правільнае разьмеркаваньне прамысловасьці ў краіне. Стварэньне новай вугольна-мэталюргічнай базы на Урале і ў Сібіру.

— Стварэньне кадраў.

— Барацьба з бюракратызмам.

— Павялічэньне вытворчасьці працы.

— Палепшаньне забясьпечаньня.

— Правядзеньне крэдытна-грашовае рэформы.

— Накапленьне рэзэрваў.

— Разьвіцьцё мэталюргіі.

— Пасунуць уперад разьвіцьцё лёгкай прамысловасьці.

— Зьніжэньне сабекошту, палепшаньне якасьці і рацыяналізацыя.

— Адзінаначальле.

— Вырашэньне жывёлагадоўчае проблемы і проблемы тэхнічных культур.

— Далейшае разьвіцьцё савгасаў і колгасаў і ліквідацыя кулацтва як клясы.

— Далейшае набліжэньне апарату да раёну, сяла.

— Транспартная проблема.

Каб ажыцьцёвіць гэтыя задачы, неабходна,—гаворыць тав. Сталін,—працягваць наступ на капіталістычныя элемэнты нашай краіны па ўсім фронце і да канца.

ЦК вёў краіну няўхільна па шляху сацыялізму

На вячэрнім пасяджэньні т. Сталін перайшоў да трэцяга разьдзелу свайго дакладу да разьдзелу— „Партыя“. У гэтым разьдзеле дакладчык падрабязна спыніўся на двух пытаньнях: кіраўніцтве ЦК соцыялістычным будаўніцтвам і кіраўніцтве ЦК унутрыпартыйнай політыкай. Тав Сталін падрабязна азнаёміў зьезд з кіраўніцтвам ЦК ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва і перад усім,—у галіне індустрыялізацыі і сельскай гаспадаркі.

— ЦК,—гаворыць т. Сталін,—вёў краіну няўхільна па шляху соцыялізму.

14-ты зьезд партыі быў зьездам індустрыялізацыі краіны.

15-ты зьезд партыі быў зьездам колектывізацыі.

16-ты зьезд—гэта зьезд організацыі суцэльнай колектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы.

14 і 15 зьезды—падрыхтоўка да разгорнутага соцыялістычнага наступленьня.

16 зьезд—зьезд разгорнутага соцыялістычнага наступленьня па ўсіх лініях.

Уся праца ЦК і партыі ў цэлым праходзіла ў барацьбе з ухіламі ад ленінізму. Трэ' было пакончыць з перажыткамі троцкізму. Трэ' было перамагчы правы опортунізм. У гэтай барацьбе партыя ўзяла перамогу.

— Але партыя,—гаворыць т. Сталін,—улічваючы абставіны, павінна працягваць і ўперад барацьбу на два франты, як з „левымі“ (якія ўяўляюць дробна-буржуазны радыкалізм), так і асабліва з правымі (якія ўяўляюць дробна-буржуазны імпэрыялізм і галоўную небясьпеку для нас) опортуністымі і прымірэнцамі да іх.

Спыняючыся на ўхілах у нацыянальным пытаньні, асабліва на вялікарасійскім шавінізьме, які ўяўляе галоўную небясьпеку ў нацыянальным пытаньні, і на мясцовым нацыяналізьме, тав. Сталін заяўляе, што партыя няўхільна павінна весьці барацьбу і з гэтымі ўхіламі, ажыцьцяўляючы інтэрнацыянальнае выхаваньне мас. Свой даклад тав. Сталін заканчвае словамі:

— У барацьбе з ухіламі ад ленінізму партыя ўзмацнілася і выхавала еднасьць сваіх шэрагаў. Партыя ніколі ня была так моцна зьяднана навокал свайго ЦК, як у сучасны момант.

16-ты зьезд—зьяўляецца першым зьездам, дзе няма аформленай, зьяднанай опозыцыі, якая асьмелілася-б адкрыта супроцьставіць сабе лініі партыі.

Мы за мінулы пэрыод дабіліся посьпехаў на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва пад сьцягам ленінізму. Калі мы хочам наперад дабівацца посьпехаў, то мы таксама павінны ісьці пад сьцягам ленінізму. Пад гэтым сьцягам, пад сьцягам ленінізму рэволюцыя пераможа ва ўсім сьвеце.

Няхай жыве ленінізм!

Апошнія словы тав. Сталіна пакрываюцца шумнымі аплёдысмэнтамі, якія пераходзяць у овацыю.

Нашы перамогі наносяць руйнуючы ўдар клясаваму ворагу

Лепшых сваіх сыноў аддамо комуністычнай партыі

ЛЕНІНГРАД, 26. Адбыліся масавыя мітынгі, якія паслалі ад імя дзесяткаў тысяч пролетарыяў гораду Леніна палкае пролетарскае прывітаньне 16-му партыйнаму зьезду. Пролетарыі Ленінграду запэўніваюць, што яны заўсёды будуць надзейнай апорай комуністычнай партыі і цэнтральнага камітэту, які ідзе па ленінскім шляху. Нашы перамогі наносяць руйнуючы ўдар клясаваму ворагу,—гавораць чырвонапуцілаўцы—па малаверах і ныціках з лягеру правых і „левых“ опортуністых.

Лепшых сваіх сыноў аддамо комуністычнай партыі, моцна яднаючы вакол яе мільённую армію барацьбітоў за перамогу соцыялізму. Мітынг рабочых заводу імя Леніна адзінагалосна прыняў рапарт XVI партзьезду і дэлегаваў для перадачы прывітаньня беспартыйнага сьлёсара тав. Іванова, які 40 год працуе на заводзе.

Да справаздачна-перавыбарчай кампаніі бюро ячэек і камітэтаў

Самаправерка---сродак хутчэйшага ажыцьцяўленьня лёзунга „тварам да вытворчасьці“

Перавыбары кіруючых органаў павінны забясьпечыць узмацненьне баяздольнасьці саюзу і паляпшэньне якасьці парткіраўніцтва ў комсамольскіх ячэйках

Работу ячэек і камітэтаў пад агонь бальшавіцкай самакрытыкі

МАЦНЕЙ АГОНЬ ПА ОПОРТУНІЗМУ

ПАРТКІРАЎНІЦТВА Ў ШЭРАГУ КОМСАМОЛЬСКІХ ЯЧЭЕК—НЕ НА ВЫШЫНІ СВАІХ ЗАДАЧ

На бюро Магілеўскага АК ЛКСМБ вызначаны шэраг практычных мерапрыемстваў па правядзеньню справаздачна-перавыбарчай кампаніі бюро ячэек. Раённым арганізацыям накіраваны брыгады на двухтыднёвы тэрмін. Брыгадам, якія знаходзяцца ў раёне па сілоснаму будаўніцтву, таксама даручана правядзеньне гэтай работы. Акругком КП(б)Б у кожны раён накіраваў па аднаму працаўніку для дапамогі комсамольскім арганізацыям.

У горадзе перавыбарчая кампанія пачнецца з 1-га ліпеня, падрыхтоўка ўжо пачалася. Мобілізаваны партыйна-комсамольскі актыў, гарком партыі вылучыў 29 адказных партыйных работнікаў. Некаторыя ячэйкі (шорная фабрыка і інш.) вылучылі брыгады.

Ня гледзячы на тое, што ў Чачэвіцкім раёне перавыбары пачаліся 15 чэрвеня, толькі тры ячэйкі вылучылі брыгады па самаправерцы. Падрыхтоўчая работа ячэйкамі, хоць яны і забясьпечаны прадстаўнікамі райкому, праведзена недастаткова.

Бараўская ячэйка на перавыбарчым сходзе ўскрыла, што сэкратар Сініца ўстроіўшыся на працу ў кооперацыі, прапіў 100 рублёў, заяўляючы, што „яны ўкрадзены“. За гэта ён, тут-жа на сходзе, выключан з комсамолу.

У ячэйцы ЛКСМБ пры колгасе „Чырвоны Пуцілавец“ дрэнна абстаіць справа з парткіраўніцтвам. Ніхто з партыйнай ячэйкі не наведваў комсамольскіх сходаў і пасяджэньняў. Сэкратар ячэйкі ЛКСМБ нават ня ведаў свайго партпрымацаванага.

Социяльны склад кіруючых органаў пасьля перавыбараў у гэтых ячэйках палепшыўся. Але трэба сказаць, што зусім дрэнна абстаіць справа з партасяродкам. Па пяці ячэйках абрана толькі тры кандыдаты партыі.

Па Магілеўскім раёне для падрыхтоўкі ячэек да перавыбарчай кампаніі ў 8 слабейшых ячэйк. выяжджалі прадстаўнікі РК. У час перавыбараў высьвятляецца таксама дрэннае становішча партыйнага кіраўніцтва. Прымацаваныя часта не адпавядаюць свайму прызначэньню, бо прымацоўваюць да комсамольскіх ячэек нявытрыманых комуністых, якія потым выключаюцца з партыі.

Партпрымацаваны да Цішаўскай комсамольскай ячэйкі Волкаў зараз выключан з партыі. На просьбу ячэйкі дапамагчы ў распрацоўцы прадзьездаўскіх матэр'ялаў ён адказаў: „Прыходзьце да мяне ў двор, а хадзіць да вас у колгас дапамагаць распрацоўваць тэзісы ня буду“.

Партпрымацаваныя Сялецкай ячэйкі —тав. Шандалаў—на перавыбарчым сходзе прапанаваў комсамольцам некалгасьнікам выйсьці са сходу.

Не ва ўсіх ячэйках самакрытыка разгорталася ў правільным напрамку. Напрыклад, у Чарнязёмаўскай і Цішаўскай (Магілеў) спрэчкі былі накіраваны на што хочаце, толькі не на пытаньні гаспадарчага замацаваньня колгасаў.

Правядзеньне перавыбараў бюро 9-ці ячэек Магілеўскага раёну праходзіла пад кутом праверкі выкананьня пастаноў у адносінах меўшых месц ў гэтай арганізацыі прарываў.

Ліўшыц.

ПАДЦЯГНУЦЬ АДСТАЛЫЯ ВУЧАСТКІ

Па Бабруйскай гарорганізацыі распачалася справаздачна-перавыбарчая кампанія бюро ячэек. Комсамольская ячэйка друкароў мобілізавала сваю ўвагу на праверку работы і выкрыцьцё ўсіх недахопаў, меўшых месца ў ячэйцы. Да перавыбарчага сходу працавала брыгада па праверцы працы ячэйкі. Да гэтай працы была прыцягнута рабочая моладзь друкарні.

Справаздачны сход прайшоў пад знакам разгорнутай самакрытыкі. Ячэйка падвяла вынікі сваёй працы па выкананьню прамфінпляну, а ў гэтым ёсьць значныя дасягненьні. **Прамфінплян выканан на 120 проц., даведзен да кожнага рабочага, узьнята вытворчасьць працы і зарплата.**

Але-ж ёсьць і недахопы. Бюро ячэйкі слаба кіравала ўдарніцтвам. Ячэйка не займалася працай сярод броньвучняў. Мала зьвярталі ўвагі падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы, якой не хапае. Ёсьць прарыў у выкананьні лічбаў па зьніжэньню сабекошту.

На сходзе дадзен наказ у далейшай рабоце бюро ячэйкі.

Кафман.

Падрыхтоўка праваліваецца

У шэрагу комсамольскіх ячэек Сьмізавіцкага раёну не вядзецца ніякай падрыхтоўкі да справаздачна-перавыбарчай кампаніі бюро ячэек ЛКСМБ і камітэтаў. Трэба сказаць, што ў рабоце арганізацыі ёсьць шэраг недахопаў: соцыялістычнае спаборніцтва не зьяўляецца мэтадам штодзённай працы, лёзунг 100-процантнага ўцягненьня рабочай і батрацкай моладзі ў ЛКСМБ не ажыцьцяўляўся ў шэрагу ячэек. Напрыклад, Дукорская комсамольская ячэйка расла галоўным чынам за кошт вучнёўскай і серадняцкай моладзі, а між іншым па сельсавеце налічваецца 65 батракоў.

Падрыхтоўка да закладкі сілосных ям і траншэй праводзіцца слаба. Дукорская ячэйка, саўгаская, а таксама і сельсавецкая не падрыхтавалі яшчэ да закладкі ніводнай сілоснай ямы. Тое самае можна заўважыць і ў Матараўскай комсамольскай ячэйцы. Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі ідзе чарапашымі тэмпамі.

Праца ў некаторых піонэратрадах адсутнічае. Трохмесячнік беларускай нацменаўскай пролетарскай культуры не зьявіўся сродкам прыбліжэньня комсамольскіх мас да непасрэднага ўдзелу ў культурна-нацыянальным будаўніцтве.

ГАРАСЬКА ПЫЖЫК.





Камітэты, якія не забясьпечваюць патрэбнага кіраўніцтва ячэйкамі ў рабоце па самаправерцы, тармазяць паварот ячэек тварам да вытворчасьці.

Самаправерка павінна дапамагчы ліквідацыі прарываў

Самаправерка па Самахвалавіцкім раёне павінна паслужыць сродкам для ліквідаваньня тых прарываў, якія меліся ў арганізацыі. Пытаньне аб самаправерцы абгаворана на бюро РК, пасланы выклік на соцыялістычнае спаборніцтва Пухавіцкай комсамольскай арганізацыі. Гэта-ж пытаньне абгаворана на плепуме РК, вылучаны 4 брыгады для дапамогі ячэйкам.

У арганізацыі быў шэраг прарываў. Кіраўніцтва раённага камітэту не змагло мобілізаваць масы на паварот арганізацыі тварам да колгаснага будаўніцтва.

Дудзіцкая ячэйка бяздзейнічала ў час ударнай працы па пасеўкампаніі. Сэкратар ячэйкі, замест таго, каб мобілізаваць комсамольцаў, уцёк на гэты час з вёскі і кінуў ячэйку без кіраўніцтва.

У Вузьлянскай ячэйцы комсамольцы нават дадумаліся да таго, што пачалі зьбіраць подпісы аб звароце высланых кулакоў. Ячэйка своечасова не рэагавала на гэта.

Масавым зьявішчам у арганізацыі былі ўцёкі комсамольцаў з колгасаў у горад. дысцыпліна адсутнічала. РК ніякіх мер проці гэтага ня прымаў.

Таму самаправерка павінна будзе дапамагчы ліквідаваць прарывы.

Самаправерка павінна будзе ажывіць падрыхтоўку да асеньняй уборачнай кампаніі і закладкі сілосных ям. Дудзіцкая ячэйка, абгаварыўшы на сходзе пытаньне аб самаправерцы, абвясьціла сябе ўдарнай і выклікала на спаборніцтва Цяплінскую ячэйку, выпусьціла прысьвечаную самаправерцы насьценгазэту.

Калінкаўская ячэйка, сумесна з рабочымі саўгасу, правяла сход, абвясьціла сябе ўдарнай і выклікала Самуэлеўскую ячэйку.

Цяплінская, Самахвалавіцкая, Прылуцкая, Воўчкаўская і Русілаўская таксама абгаварылі гэтае пытаньне, абвясьцілі сабе ўдарнымі, выклікалі на соцспаборніцтва другія ячэйкі.

Чарга за тым, каб ячэйкі на практычнай рабоце давялі, што могуць па-ўдарнаму выканаць парт. задачы.

Клябанаў.

Мітынг, прысьвечаны самаправерцы

На заводзе „Энэргія“ адбыўся мітынг, прысьвечаны пытаньням самаправеркі колектыву КСМ. На мітынгу прысутнічалі комсамольцы, беспартыйная моладзь і старыя рабочыя. Пасьля мітынгу шэраг комсамольцаў запісаўся ў брыгады па самаправерцы. Па цэхох разьвешаны лёзунгі і пастаўлены скрынкі для збору матэр'ялаў па самаправерцы. Організаваныя брыгады прыступаюць да працы.

Б.

ПЕРАД АСЕНЬНІМ НАБОРАМ У ФАБЗАВУЧЫ

Бабруйск не пачаў рыхтавацца

Акругком спадзяецца на Акр'інспэктарыят, інспэктарыят на акругком, у выніку—абодва нічога ня робяць. Гаспадарнікі гавораць і галасуюць за фабзавуч, на справе выступаюць супроць яго

Аб падрыхтоўцы кадраў у Бабруйску, як і ўсюды, **гавораць шмат. Аднак, робяць куды менш.** Для некаторых прадпрыемстваў ЦІП стаў асноўнай формай для падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы. Белдзяржбуду, напрыклад, у 1930-1931 годзе патрабуецца 476 кваліфікаваных будаўнікоў у 31-32—яшчэ большая колькасьць.

„ЦІП усё вывезе“

Запыталіся мы ў дырэктара Бабруйскага аддзяленьня Белдзяржбуду **т. Трафімава,** адкуль і праз якія формы навучаньня яны думаюць атрымаць патрэбную колькасьць рабочых,—**„Праз ЦІП, які існуе ў Бабруйску“,—адказаў дырэктар.** А добра-ж ведае дырэктар, што выпускнікі апошняга выпуску ЦІП'у зараз яшчэ на біржы, бо ніхто іх ня прымае на працу.

На чыгунна-ліцейным заводзе зараз працуе 280 чалавек рабочых. Праз год будзе 450 чалавек. Адміністрацыя заводу зусім ня думае аб патрэбных заводу кадрах. Яна абмежавалася наборам 30 палетчыкаў для брыгаднага вучнёўства і 28 вучняў, якія пастаўлены на індывідуальнае навучаньне. А чаму не організаваць фабзавуч, скажаце вы? Можна організаваць, але аб гэтым мала хто клапоціцца. Праўда, дырэктар—тав. Каровін заявіў нам, што ён нібы летась уздымаў перад прамтрэстам пытаньні аб організацыі фабзавучу, але далей гэтага справа не пайшла. Адміністрацыя мотывуе непатрэбнасьць організацыі фабзавучу адсутнасьцю варштатаў. А для індывідуальнага вучнёўства варштаты ёсьць.

Пастановы, аб якіх ніхто ня ведае

6-га чэрвеня АК ЛКСМБ вынес пастанову аб організацыі ў гэтым годзе яшчэ трох фабзавучаў: будвучу пры Белдзяржбудзе, пры чыгунна-ліцейным заводзе і пры швейнай фабрыцы. Аказваецца, пастанова і засталася пастановай. **Акругком нават і не паклапаціўся паведаміць аб сваёй пастанове тыя гаспадарчыя організацыі, дзе мяркуецца адчыніць фабзавуч.** Нічога ня зроблена ў напрамку організацыі грамадзкай думкі навокал фабзавучаў, ні на крок не пасунуліся ў напрамку выкрыцьця опортуністычных поглядаў некаторых адміністратараў на падрыхтоўку кадраў праз фабзавучы. Акругком сам не дацаніў важнасьці падрыхтоўкі кадраў, ад чаго не адмаўляюцца самі акругкомаўцы.

Зьвярнуліся мы да інспэктара асьветы, тав. Пакроўскага, з запытаньнем:

— Хто кіруе працай профтэхасьветы і што ён робіць у напрамку падрыхтоўкі асеньняга набору ў фабзавучы?

— Мы гэтым пытаньнем не займаемся: гэтым займаецца акругком комсамолу,—адказаў ён.

— Чым-жа, усё такі, тлумачыцца, што гэтыя пытаньні выпалі з пункту гледжаньня вашай работы?—пытаюся далей у тав. Пакроўскага.

— Бачыце, па каштарысу ў нас не прадугледжана, па пляну няма сталага працаўніка,—адказвае ён.

Вось што дрэнна адбіваецца на рабоце па падрыхтоўцы кадраў. Выходзіць, што АК комсамолу ў надзеі, што пытаньнем профтэхасьветы і ФЗВ займаецца інспэктар Нарасьветы, а інспэктарыят Нарасьветы ў надзеі на АК. **А ў выніку—ніхто нічога ня робіць.**

Толькі зараз прыняты сякія такія захады па гэтаму пытаньню.

Яшчэ горш адносяцца да падрыхтоўкі кадраў для навучальных устаноў у Бабруйску. Нядаўна брыгадзірша з Менскага Яўпэдтэхнікуму завербавала на швейнай фабрыцы 15 рабочых у яўпэдтэхнікум, але адміністрацыя катэгорычна адмовілася адпусьціць іх з фабрык. Яшчэ і да гэтага часу ні інспэктарыят Нарасьветы, ні іншыя організацыі не паказалі адміністрацыі швейнай фабрыкі на недапушчальнасьць іх дзеяньняў.

Заклікаў „Комсамольскай Праўды“ і „Чырвонай Зьмены“ не пачулі

Некалькі слоў аб падрыхтоўцы да надыходзячага асеньняга набору ў фабзавучы. Бабруйская акруга мае толькі адзін фабзавуч пры комбінаце з 113 чалавек. Фабзавуч дасягнуў посьпехаў у вытворчым навучаньні. Фабзайцы пасьля 9 месяцаў заняткаў ужо замяняюць майстроў у часе адпачынку, яны—ударнікі на заводзе, яны служаць прыкладам для астатніх. Сярод некаторай часткі рабочых нават існуе думка, нібы фабзавуч выцесьніць кваліфікаваную частку з комбінату, а пашлюць старых рабочых на біржу. Гэтым шкодным чуткам ніхто не дае адпору, ніхто не рэагуе. Аб асеньнім наборы ў фабзавуч у комбінаце **ніхто не клапаціцца.** Набору пагражае зрыў. Ні ячэйка комбінату, **ні акругком яшчэ ня прынялі ніякіх захадаў да падрыхтоўкі набору.**

Дробязь, якая зрывае пабудову ФЗВ

Дырэктар комбінату—тав. **Шклярман**—заявіў нам, што асеньні набор зрываецца. Думаем,—кажа ён,—зрабіць набор яшчэ на 200—250 чал. Для гэтага трэба памяшканьне, бо цяперашняе ня можа зьмясьціць новага набору. Ставіў я пытаньне перад ВСНГ, але ніякага адказу не атрымаў. Ні Лесбел, ні ВСНГ на пабудову будынку не адпушчаюць сродкаў. Ды і ня так ужо многа іх і трэба, бо ў комбінаце матэр'ялы для будаўніцтва ёсьць. Галоўная астаноўка—**за дазволам з боку ВСНГ на пабудову.**

Бабруйскі комсамол на чале з акругкомам, на выклік „Комсамольскай Праўды“ і „Чырвонай Зьмены“ уступіць у соцыялістычнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне асеньняга набору ў ФЗВ, **адказвае маўчаньнем.** У гэтым напрамку яшчэ ня зроблена нічога.

Аб усім гэтым павінен сказаць сваё рашаючае слова склікаемы ў хуткім часе пленум АК ЛКСМБ.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены“
В. Бэрнштэйн.

МЕНСК—МАСКВА

Старт велё-мото эстафэты

Учора а 12-й гадзіне на Пляцы Волі быў дадзен старт вэлё-мото эстафэце Менск-Масква.

У эстафэце прымаюць удзел 11 вэлёсыпэдыстых, 2 мотоцыклісты і 2 легкавыя машыны. Разам з эстафэтай выехаў спэцыяльны корэспондэнт „ЧЗ“ і корэспондэнт кіно-часопісу Белдзяржкіно—„Беларусь Савецкая“.

А. К.

ЁСЬЦЬ СІЛЫ, ЁСЬЦЬ ЖАДАНЬНІ ПРАЦАВАЦЬ, АЛЕ НЯМА КІРАЎНІЦТВА

Групы „Лёгкай Кавалерыі“ ў большасьці акругах цягнуць мізэрнае існаваньне

КАМІТЭТЫ КОМСАМОЛУ, ВЫ ЗАБЫЛІСЯ АБ КІРАЎНІЦТВЕ „ЛЁГКАЙ КАВАЛЕРЫЯЙ“. ЦІ ДОЎГА БУДЗЕ ТАКОЕ СТАНОВІШЧА?

ХОПІЦЬ НАПАМІНАЦЬ

Мы патрабуем бальшавіцкага кіраўніцтва „Лёгкай Кавалерыяй“!

У рэдакцыю ідуць трывожныя весткі. Амаль ува ўсіх акругах, асабліва ў апошні час, праца групы „ЛК“ заглохла, за што гавораць усе друкаваныя раней і сёньня матар'ялы ў нашай газэце.

Буйнейшым фактарам у рабоце „Лёгкай Кавалерыі“ за апошні час зьяўляецца організацыя ўсесаюзнага адначасовага налёту па пытаньню давядзеньня прамфінпляну да цэху, брыгады, агрэгату і паасобнага рабочага.

Якія-ж вурокі гэтай работы „Цэлы шэраг мясцовых груп „ЛК“ праявіў непаваротлівасьць, няўменьне пабаявому організаваць налёт, ня змог прыцягнуць да сябе ўвагу ўсіх грамадзкіх організацый“.

У Беларусі непаваротлівасьць камітэтаў комсамолу і штабаў „ЛК“ прывяла да таго, што налёты былі праведзены несвоечасова і не далі патрэбных вынікаў. Штаб, які ня кіруе, які і не распрацоўвае опэрацыйных заданьняў для груп—ня штаб. А ў нас, на жаль у большасьці сваёй штабы.

У рэдакцыю кожны дзень прыбываюць менавіта такія юнкораўскія лісты, штодзённа трывожна заяўляюць што: штабы ня кіруюць, штабы не даюць заданьняў, штабы бязьдзейнічаюць.

Усе гэтыя весткі прымушаюць нас сёньня ўжо ня толькі напамінаць комсамольскім камітэтам аб нездавальняючай рабоце груп „Лёгкай Кавалерыі“, а біць трывогу і патрабаваць сапраўднага бальшавіцкага кіраўніцтва гэтым масавым рабочым кантролем.

Мы маем факты, якія гавораць, што з-за бязьдзейнасьці штабаў, напрыклад у Жлобіне зусім быў сарваны налёт па-праверцы давядзеньня прамфінпляну да варштату. У іншых акругах камітэты комсамолу і штабы „ЛК“ безадказна, бюрократычна аднесьліся да гэтай справы.

„Лёгкая кавалерыя“, з-за таго што ёю ня кіруюць, ня толькі не павярнулася „тварам да вытворчасьці“, ня толькі не павярнулася тварам да гаспадарчага фронту, а нават у апошні час мясцамі зусім злажыла аружжа.

„Чырвоная Зьмена“ ўвесь час давала трывожныя сыгналы аб тым, што з масавым рабочым кантролем, з комсамольскай „коньніцай“—„лёгкай кавалерыяй“ ня добра. Але комсамольскія камітэты і штабы „ЛК“ не пачулі нашых сыгналаў. Газэта ўвесь час гаварыла, што рашэньні ўсебеларускага зьлёту „ЛК“ не даведзены да масы, што дэлегаты ўсебеларускага зьлёту па прыезьдзе на месцы не рабілі справаздач аб выніках зьлёту, а камітэты комсамолу і часткова ЦК ЛКСМБ недастаткова энэргічна рэагавалі на гэта, у выніку чаго, яшчэ і н сёньнешні дзень рашэньні зьлёту знаходзяцца... у друкарні.

Ад „лёгкай кавалерыі“ зараз патрабуецца мобілізацыя сіл на барацьбу з бюрократызмам, які падрывае работу, з усімі хто перашкаджае выконваць і перавыконваць прамфінплян, супроць провокацый і шкодніцтва кулацтва, якія накіраваны на зрыў колектывізацыі. Правяраць і дапамагаць сельсаветам ажыцьцяўляць апошнія рашэньні ЦВК СССР аб ролі сельсаветаў у сувязі з колектывізацыяй і задачай ліквідацыі кулацтва, як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі. Быць організатарамі ў пастаноўцы працы ўнутры колгасу. Правяраць становішча работы па сілосаваньню, праверыць як працуюць клюбы, хаты-чытальні, як ідзе падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі, як ідзе праца па ліквідацыі няпісьменнасьці, па забясьпечаньню лемантарамі і інш.

„Лёгкая кавалерыя“ зараз на даным этапе павінна неадкладна мобілізаваць усе сілы на тое, каб самаправерка работы КСМ прайшла-б сапраўды па-бальшавіцку, а не апашлялася, ня была-б рэвізіяй паасобных таварышоў.

„У профапараце зьвілі сабе моцнае гняздо абыдзёншчына і закаранеласьць, бюрократызм і адрыў ад мас, непаваротлівасьць і павольнасьць у тэмпах“... (З адозвы прэзыдыуму УсеЦСПС).

Опортуністычная спадчына ў рабоце профорганаў дагэтуль яшчэ канчатковa ня выжыта. „Рэшткі опортуністычных і трэд'юніонісцкіх элемэнтаў профапарату праяўляюць закаранеласьць і абмежаванасьць, перашкаджаюць пераходу саюзаў на новыя рэйкі“. З усім гэтым „Лёгкая кавалерыя“, сумесна з рабочай масай, асабліва ў час перавыбараў фабзаўмясцкомаў, павінна змагацца.

Патрэбна рашуча змагацца з тэндэнцыямі зьвядзеньня работы „ЛК“ выключна да „налётаў“, наскокаў, рэвізіі. Пара ўрэшце ўцяміць, што „кавалерысты“ павінен быць перадавым, прыкладным у рабоце, на якім-бы вучастку ён ні стаяў. Што, выконваючы задачу павароту работы КСМ тварам да гаспадарчых задач, „кавалерысты“ абавязан быць у першых шэрагах барацьбітоў—непасрэдных творцаў гэтага павароту.

Мы патрабуем ад комсамольскіх камітэтаў не фармальнага, выпадкова а, а паўсядзённага кіраўніцтва „ЛК“, каб пры дапамозе гэтага масавага кантролю садзейнічаць пасьпяховаму выкананьню „пяцігодкі ў чатыры гады“!

Змарнелая расьліна



У „сяроўскім“ абкружэньні.

Хто ў гэтым вінаваты?

Пры Ўваравіцкай ячэйцы ЛКСМБ (Гомельшчына) існуе група „лёгкай кавалерыі“. За ўвесь доўгі час свайго існаваньня гэта група зрабіла... адзін „налёт“ на спажывецкую коопэрацыю, але і гэтую справу не давяла да канца, не зрабіла належных вынікаў з гэтага „налёту“.

Вось і ўвесь „рапарт“ „вялікай“ працы ўваравіцкіх „кавалерыстых“.

Кіраўніком гэтай групы вылучан тав. **Равінскі**, які лічыць, што для кіраваньня „лёгкай кавалерыяй“ у яго няма часу, а таму і ня можа быць ніякай працы. „Пакіраваў“ некаторы час тав. **Равінскі**, але-ж з гэтай працы нічога ня вышла. Вылучылі другога-тав. **Аўраменка М.**—але пры апошнім тое-ж самае зьявішча.

Мы пытаем у бюро комсамольскай ячэйкі—хто ў гэтым вінаваты?

Вадзім Веніямінаў

Дзе „лёгкая кавалерыя“?

Аб тым, што існуе групай „лёгка кавалерыі“ на заводзе „Энэргія“ наўрад-ці вам скажа хоць адзін рабочы. Некалі яна існавала, але зараз, калі бюро колектыву вылучыла для кіраўніцтва „лёгкай кавалерыяй“ комсамольца, які не жадае працаваць—праца заняпала.

„Лёгкая кавалерыя“ не рэагавала на спазьненьні з адпраўкай камвядрабілак, не рэагавала на павялічэньне браку ў ліцейным цэху.

„Лёгкая кавалерыя“ не рэагавала на ненормальнасьці, якія наглядаюцца на прадпрыемстве. Не рэагавала на невыкананьне прамфінпляну, на недавядзеньне яго да брыгады, да варштата.

Гэтыя факты кажуць за тое, што „лёгкая кавалерыя“ не павярнулася тварам да вытворчасьці, а была толькі зьвязана з РСІ. Ніякага кіраўніцтва і дапамогі за ўвесь час існаваньня групы „Л. К.“ пры заводзе „Энэргія“ ня было.

Штаб „лёгкай кавалерыі“ пры заводзе „Энэргія“ трэба пераабраць, трэба даць працаздольнае кіраўніцтва.

Альтман.

ДАВОЛІ СЛОЎ

Вось ужо амаль паўгода, як праца ў атрадзе „Лёгкай кавалерыі“ Наркам'юсту перастала быць працай, бо **Фэйгэнбаум**—кіраўнік атраду—не жадае працаваць, а таму і ня склікае „кавалерыстых“.

Амаль на кожным пасяджэньні бюро колектыву гавораць аб „лёгкай кавалерыі“, але нічога конкрэтнага няма. Работа „ЛК“ у Наркам'юсьце—пустое месца, а работы для „ЛК“ у гэтай установе хоць адбаўляй.

Пара ўжо наладзіць кіраўніцтва і працу „лёгкай кавалерыі“.

Ад бюро комсамольскага колектыву мы чакаем справы, а ня слоў.

Стамеска.

Увесь гвозд у кіраўніцтве

У Рудзінскім сельсавеце, Сьмілаўскага раёну ёсьць шмат недахопаў. Пры гэтым сельсавеце організавана група „лёгкай кавалерыі“, якая павінна была змагацца з усімі гэтымі недахопамі, але, на жаль, **з-за дрэннага кіраўніцтва, група нічога ня робіць.**

Патрэбна ажывіць працу гэтай групы.

Каліна

Ігноруюць прапановы „кавалерыстых“

Атрад „ЛК“ Сл.-Парышаўскага сельсавету (Вузьдзенскі раён, Меншчына) выявіў шмат недахопаў у працы Вузьдзенскай організацыі. Напрыклад, прыказчык—**Кухарчык Антось**—груба адносіцца да наведвальнікаў. Любімчыкам дае тавары без чаргі. 11 чэрвеня **Кухарчык** зусім не зьявіўся на працу таму, што ён добра „пагуляў“ у вёсцы Старыя Маргі.

У краме няма кнігі для скаргаў.

Усе гэтыя недахопы выявіла „лёгкая кавалерыя“ і зрабіла адпаведныя прапановы **Але... прапановы „ЛК“ застаюцца толькі прапановамі, а бясчынствы працягваюцца.**

Вузьдзенскі РК ЛКСМБ павінен зацікавіцца працай „ЛК“, больш кіраваць ёю.

Сымон.

Хто павінен кіраваць?

Да зьлёту груп „Л. К.“ Пухавіцкага раёну па лініі „Лёгкай кавалерыі“ нічога ня было зроблена. Прайшоў зьлёт і мы прымушаны констатаваць, што, ня гледзячы на вельмі добрыя і прыгожыя дырэктывы, штаб не працуе і ня кіруе працай груп.

Каліна.

Атрад, які тае

Атрад пры ВСНГ, які організаваўся ў студзені 1930 году і налічваў тады 8 чалавек, зараз налічвае ўсяго 3 чалавекі.

Галоўная праца гэтых траіх чалавек—„налёты“. Але гэтыя „налёты“ амаль ніякіх вынікаў не далі. Чым тлумачыцца слабая праца гэтай групы „Л. К.“? Тлумачыцца гэта тым, што ніякага кіраўніцтва з боку раёну, колектыву КСМ няма, праца ідзе самацёкам і пагэтаму яна занепадае.

Брыгада ЦКК.

ЗЬНІШЧЫЦЬ ПРАРЫЎ

У Жлобіне як і ўсюды ёсьць комсамольская організацыя, з ў Жлобінскай комсамольскай організацыі ёсьць „лёгкая кавалерыя“, якая... (выбачайце, таварышы, не хачу хлусіць, я трохі памыліўся)—была „лёгкая кавалерыя“, а цяпер.. вечная ёй памяць,—няма!

Калі была „лёгкая кавалерыя“, дык, неяк весялей было,—усё-ж такі ёсьць. Праўда, калі мы паглядзелі, што зроблена гэтай „і нужчай“ „кавалерыяй“ дык неяк цяжка зрабілася, бо ніякай работы мы ня бачылі. А цяпер... Што і казаць... яшчэ горш, чым раней. У райкоме комсамолу ёсьць член райкому—**Манкевіч Я.**,—ён-жа начальнік штабу „лёгкай кавалерыі“. І вось,—ёсьць начальнік штабу, але няма штабістых і кавалерыстых. І гэта, па Жлобінскаму,—добра. Усе з гэтым згодны. Усе аб гэтым маўчаць.

Праходзіў у **Жлобіне** агляд грамадзкага харчаваньня. Пры райкоме комсамолу пад кіраўніцтвам **Манкевіча** група комсамольцаў пашла праверыць харчаваньне. Праверылі адну сталоўку і станцыйны буфэт. Знашлі шмат недахопаў. Гэтым агляд грамадзкага харчаваньня і скончыўся.

Зусім нядаўна ўсе газэты пісалі аб тым, што „ЛК“ павінна праверыць, ці давёдзен прамфінплян да варштата, да кожнага рабочага паасобку. Але гэта не датычылатя, мабыць, жлобінцаў. Аб гэтым яны ня ведалі і агляду ніякага не рабілі, бо, бачыце, няма каму праводзіць гэты агляд.

Усё вышэй дададзенае гаворыць аб тым, што на фронце комсамольскай працы ў справе кіраўніцтва і работы „ЛК“—прарыў. Хто ў гэтым вінаваты? Мы лічым, што ў гэтым вінавата раённае комсамольскае кіраўніцтва.

Сяргей Асоўскі.

32 няпоўных!

Атрад „Л. К.“ пры абутковай фабрыцы налічвае 32 чалавекі, але яны існуюць толькі на паперы. На самой справе працуе ўсяго 12 чалавек, якія і ўдзельнічаюць у жыцьці прадпрыемства. Накаторыя „лёгкія кавалерыстыя“ былі ілжэўдарнікамі. Яны зараз выключаны з „Л. К.“.

Але і гэтыя 12 чалавек не рэагуюць на простоі, рэдка выступаюць на вытворчых нарадах і недастаткова ўдзельнічаюць у чыстцы апарату Наркомзему і ЦРК. З боку раёнага кіраўніцтва дапамогі таксама няма

Якабсон і Кузьнец

МАЛЕНЬКІ ФЭЛЬЕТОН

Густы Лявона Мядзьведнікава

Лаўка спажывецкага таварыства Вятухноўскага сельсавету, Касцюковіцкага раёну (Магілеўшчына), біткам набіта народам. Коопэратар—**Лявон Мядзьведнікаў**—увесь у поце, мятусіцца з аднаго канца прылаўку ў другі.

Патрэбнасьць сялян з кожным днём расьце, з кожным днём расьце колькасьць пайнікаў. Кожны дзень патокам валяць людзі. І кожнаму дагадзі. Аднаму—дай гэта, другому—тое, а трэцяму—іншае... І так кожны дзень.

— Замучылі, чэрці!

Вось і зараз—таксама „бедны“ мятусіцца з кута ў кут. А бабы галдзяць... Вось ён спыніўся. Што гэта?

— Гэй, вы, хахлаткі чортавы — не галдзеце! Дайце дарогу!

Лявон крычыць, робіць злосны твар, потым зьзяе, як вясеньняе сонца. Ды як ня зьзяць? Ён-жа стараецца для прыгожай дзяўчыны. Гляньце на яе. Вось яна ідзе—не дзяўчына, а лялька. І, канешне, **Лявон** ня будзе затрымліваць дзяўчыну з пекным тварам. Гэтыя кудлатыя бабы, якія ад раніцы стаяць тут у чарзе і гарланяць, яшчэ троху пачакаюць. А ёй, неяк не да пекнага твару стаць у чарзе.

Лявон адпіхае крыклівую бабу і кланяючыся зьвяртаецца да толькі што прышоўшай дзяўчыны:

— Вам што даць? Колькі?

Прыгожая дзяўчына зьняважліва глядзіць на крыклівых жанчын і фанабэрыста гаворыць Лявону, што ёй патрэбна. Той з дзіўным спрытам і рухавасьцю хітрага ліса рэжа, важыць закручвае ў паперу і падае пекнай жанчыне. Тая бярэ продукты і хітра ўсьміхаецца. Лявон дугою выгінаецца ў галянтным паклоне.

— Пажалце, пажалце, красуня! Кніжачку ня трэба, ня трэба. Вы так прыгожы, што з-за вашага прыгожага твару, я даю вам бяз кніжкі.

Прыгожая дзяўчына з амбіцыяй падняўшы галаву выходзіць з пакункамі з лаўкі.

Стаяўшыя ў чарзе кабеты дзікімі кошкамі кідаюцца да Мядзьведнікава.

— Сволач!

— Мы з раніцы стаім тут, а ты без чаргі адпушчаеш!

— Мы скардзіцца будзем!

Але... Бедныя жанчыны Вятухноўскага сельсавету! Відаць паложана вам так марнавацца.

Замест таго, каб хутчэй адпусьціць продукты, Лявон адразу пасьпешна кідаецца на жанчын:

— Гэй, вы, гарлапаі,—выходзь!

Жанчыны горш ранейшага крычаць:

— Ды ня муч, чорт паласаты!

— Адпусьці нам продукты і мы пойдзем!

— Выходзь, гавару! Выходзь і ніякіх гваздоў, бо дзьверы зачыняю!

— Ты раней адпусьці тавар, а тады зачыняй.

— Выходзь! Ня бачыце, што-ль, старшыня і сэкратар сельсавету прышлі? Ім тавар адпушчаць трэба.

— Дык што-ж, што ім трэба, нам таксама патрэбна!

— Хай у чарзе пастаяць!

— Выходзь, — зачыняю дзьверы! Старшыні і сэкратару толькі пры зачыненых дзьверах адпушчаю продукты.

Лявон выпхнуў расхваляваных жанчын і зачыніўся з старшынёю і сэкратаром сельсавету.

* *
*

Вы, чытач, магчыма падумаеце, што гэта фантазія фэльетоністага? — Ні ў якім разе. Аб гэтым факце нам піша юнкор „трое“. Мы пішам у РСІ і лічым, што РСІ „сьпіша“ каго патрэбна.

Цішка Верны.

І ў моцнай ёсьць слабыя бакі.

Група „Л. К.“ пры саюзе друкароў досыць моцная. Яна налічвае ў сваім складзе 16 комсамольцаў і 8 беспартыйных, у тым ліку і 5 старых рабочых. Усе сябры групы „лёгкай кавалерыі“ актыўна ўдзельнічаюць ва ўдарных брыгадах і рэагуюць на ненормальнасьці, якія маюцца на самым прадпрыёмстве.

З боку раённага кіраўніцтва ніякай дапамогі няма. З боку колектыву КСМ таксама. **Соц-спаборніцтва паміж групамі „Л. К.“ не праводзіцца.**

К. Я.

КЛЯСА СУПРОЦЬ КЛЯСЫ

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ КОМДЭПУТАТА ШНЭЛЬЛЕРА

БЭРЛІН, 26.—У спрэчках аб бюджэце міністэрства замежных спраў комдэпутат тав. Шнэльлер указаў, што Курціус у сваёй прамове імкнуўся адчапіцца агульнымі фразамі. Урад за апошнія месяцы ўмерыў свае выпады супроць Савецкага Саюзу, стаў рабіць асьцярожныя заявы аб савецка-нямецкіх адносінах, жадаючы выйграць за свае паклёпы на цесных сувязях з СССР, для таго, каб прымусіць заходнія дзяржавы пайсьці на магчымы большыя ўступкі. Але нямецкую рабочую клясу нельга правесьці ў пытаньні аб сапраўдным характары нямецкай „цеснай" політыкі.

Уся ангельская і нямецкая буржуазія вымушана пад скрыгатам зубоўным уступіць з Савецкім Саюзам у эканамічныя зносіны. Далей тав. Шнэльлер рэзка зганьбіў антысавецкую інтэрпэляцыю па поваду рэлігійных прасьледваньняў у СССР і заявіў: рэлігійны пролетарыят капіталістычных краін павінен быць на варце і ніякімі мерамі нямецкая буржуазія не паслабіць магутную солідарнасьць нямецкіх рабочых з савецкімі рабочымі і сялянамі.

Пілсудчыкі рыхтуюць новую ганебную провокацыю

ВАРШАВА, 26.—У друк правіклі весткі аб новай ганебнай провокацыі, якую рыхтуюць пілсудчыкі ў сувязі з назначаным на 29 чэрвеня зьездам цэнтра-левых партый у Кракаве. Мясцовыя аддзелы „Саюзу легіонэраў" ва ўсёй краіне атрымалі загад наладзіць масавыя „экскурсіі" сваіх членаў у Кракаў 29 чэрвеня. Такія-ж загады атрымалі і іншыя фашысцкія ваенныя організацыі—„Стралец" і да гэтага падобныя. Чыгункі прадстаўляюць „экскурсантам" ільготны праезд. Рэшту выдаткаў пакрываюць організацыі. Адначасова кракаўскі друк пілсудчыкаў распаўсюджвае чуткі, быццам „комуністыя імкнуцца спровоказаць зьезд і ў выніку адбудуцца нежаданыя падзеі". Бундаўская „Фольксцэйтунг" у сувязі з гэтым піша: „Такім чынам мы будзем сьведкамі наступнага зьявішча: тысячы легіонераў будуць мобілізаваны на 29 чэрвеня і наводняць Кракаў. Яны будуць належным чынам „інструктаваны", а потым атрымаецца, што комуністыя спровокавалі.

Рэволюцыйны зьлёт комуністычнай моладзі ў Аўстрыі

8 і 9 чэрвеня адбыўся ў Трайзэнтале (Аўстрыя) рэволюцыйны зьлёт комуністычнай моладзі. У зьлёце ўдзельнічала некалькі тысяч рабочай моладзі.

Мобілізаваныя значныя сілы жандараў трымалі сябе надзвычайна провокацыйна, неаднакроць атакоўвалі моладзь. У выніку сутычак з поліцыяй ёсьць многа раненых; утвораны масавыя арышты.



НА ЗДЫМКУ: Поліцыя займае памяшканьне фабрыкі, у якой былі сконцэнтраваны галоўныя сілы поліцыі супроць моладзі.

Шансійскія войскі занялі горад Цзізяня

ПЭЙПІН, 25. Паводле паведамленьня з Цзінаня (сталіца Шандуня) шансійскія войскі сёньня раніцой уступілі ў горад. Мясцовы консульскі корпус зьвярнуўся па тэлеграфу да Ой-Шая з просьбаю тэрмінова прыслаць адказнага ваеннача льніка для заняцьця Цзізяня, пакінуўшага войскамі Хан-Фу-Чжу.

Дэлегацыя аўстрыйскіх футболстых у СССР

ВЕНА, 23. Рэформісцкі рабочы спортыўны саюз Ніжняй Аўстрыі выключыў з саюзу рабочых футболістых, якія езьдзілі ў СССР. Ня гледзячы на гэта, гэтымі днямі ў СССР выяжджае для стрэчы з савецкімі футболістымі новая рабочая каманда футболістых.

Нэвіль Чэмбэрлен назначаны старшынёю консэрватыўнай партыі

ЛЁНДАН 24. Сход парляманцкай фракцыі консэрватараў, скліканы ў адказ па кампанію Ротэрміра і Бівэрбрука і па патрабаваньні адхіленьня Болдуіна ад кіраўніцтва консэрватыўнай партыяй, прыняў рэзолюцыю, якая выказвае давер'е політыцы Болдуіна, як лідэра партыі. Сёньня паведамляюць, што Нэвіль Чэмбэрлен назначан старшынёю консэрватыўнай партыі, замест падаўшага ў адстаўку Давідсона. Гэта сьведчыць аб тым, што Чэмбэрлен разьлічвае ўзяць на сябе кіраўніцтва консэрватыўнай партыяй, калі сучасны лідэр яе—Болдуін акажацца прымушаным выйсьці ў адстаўку.

ЗЬНЯВОЛЕНЫЯ КОМУНІСТЫЯ

ДАБІЛІСЯ АДНАЎЛЕНЬНЯ СПАТКАНЬНЯЎ І ПЕРАДАЧЫ ЛІТАРАТУРЫ

ПАРЫЖ, 26. Зьняволеныя ў ваеннай турме Клерво комуністыя на чале з Марці пасьля ўпартай барацьбы дабіліся аднаўленьня спатканьняў і перадачы літаратуры. „Юманітэ" адзначае, што міністэрства юстыцыі прымушана было пайсьці на ўступкі зьняволеным з прычыны ўсеагульнага абурэньня рабочых мас. У прыватнасьці, у горадзе Труа, дзе знаходзіцца турма Клерво, адбыліся шматлікія мітынгі протэсту супроць рэпрэсій у адносінах зьняволеных комуністых.

УСЕУКРАІНСКАЯ ВЫСТАЎКА ДРУКУ

(АД НАШАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

У Харкаве зараз адчынена ўсеукраінская выстаўка друку, прысьвечаная XI зьезду КП(б)У. Звычайнай корэспондэнцыяй цяжка, нават немагчыма абмаляваць усё тое, што бачыш, што сабрана ў вялікіх залях—такое вялікае ўражаньне, так шмат бакова адбіт грандыёзны размах росту пролетарскага друку братэрскай рэспублікі—Украіны за гады пролетарскай дыктатуры.

Першае ўражаньне такое: як быццам апынуўся ў вялікім заводзе, дзе сотні варштатаў, прыводных рамнёў, трансмісій. Характэрная адзнака выстаўкі—яе высокая мастацкая апрацоўка. Усё на выстаўцы, пачынаючы ад насьценгазэт і канчаючы мастацкай літаратурай, так змонтажавана, што не толькі вабіць вока, але глыбока ўрэзваецца ў памяць, дапаўняе адно другога,—наогул пакідае моцнае ўражаньне ў гледача.

Сьветлавыя лёзунгі каротка і сьцісла абагульваюць кожны разьдзел выстаўкі.

— Геть релігію —ворага пятирички!

— Зміцнюймо оборону СССР!

— Загартуймо більшавіцку зьміну!

Гэта лёзунгі над аддзеламі літаратуры: антырэлігійнай, па абароне краіны і комсамольскай.

Асабліва выразна кідаецца ў вочы сьветлавы лёзунг: „За генэральную лінію партыі". Тут сабраны ўсе матар'ялы бальшавіцкіх зьездаў і конфэрэнцый. Выстаўка мастацкі расказвае аб ролі друку ў эпоху дыктатуры пролетарыяту і яе вялізарнейшых дасягненьнях. Вялікая заля адведзена для пэрыодычнага друку—насьценгазэт, газэт друкаваных і часопісаў. Пасярэдзіне залі—дынамо - машына з надпісам: „КП(б)У". Ад дынамо—пасы да рулонаў паперы.

На пасах надпіс: „Рабоча-сялянські друк". Зразумела, друк—прыводны пас да шырокіх працоўных мас, клясавы выхавальнік, праваднік комуністычных ідэй. Так мастацкай мовай гаворыць выстаўка. Побач—друкарская машына і наборнае аддзяленьне. Лічбы і выстаўка: 344 заводзкія газэты, 140 газэт, выпушчаных на вёсках выязднымі рэдакцыямі. Склад селькораў—62 проц. беднякоў і 64 проц. колгасьнікаў, — практычна паказваюць, як і чыімі рукамі будуецца пролетарскі друк Украіны.



Усеукраінская выстаўка друку.

У 1926 годзе адбыўся X зьезд КП(б)У. У 1930—XI зьезд. За гэты пэрыод газэты УССР дасягнулі значных посьпехаў.

„Комуніст" у 1917 годзе меў тыраж—29 тысяч экзэмпляраў, а ў 1930 годзе—142 тысячы экз. „Работніча—газэта Пролетар" у 1927 годзе—9800, у 1930—80000.

„Радяньське Село" у 1927 годзе 155.875 экз., у 1930 г.—612000. Наогул тыраж украінскіх газэт з 931472 экз. у 1927 годзе павялічыўся да 2.471.372 экз. у 1930 годзе.

Бяз лішніх комэнтарыяў аддзел росту кніжнай продукцыі гаворыць аб уздыме пролетарскай нацыянальнай культуры Украіны.

У 1919 годзе тыраж кніжнай продукцыі складаў 1.302.200 экз. з якіх на украінскай мове—551200 экз.; у 1930 г.—5.950.000, з якіх на украінскай мове—5.060.000. Па пяцігодцы вызначана, што ў 1933 годзе будзе 12.000.000, з якіх на украінскай мове—10.800000

Але жыцьцё перагнала гэтыя кантрольныя лічбы. Выдавецтвам зараз выканана програма 1931 г. а ўся пяцігодка па кніжнай продукцыі будзе выканана ў тры гады.

Выстаўка дае вялікі ўклад у нацыянальна-культурнае будаўніцтва Савецкай Украіны. Яна паказвае, што пролетарыят УССР, у саюзе з беднатой і серадняцкімі масамі вёскі, пад кіраўніцтвам КП(б)У, у клясавай барацьбе выкоўвае сваю культуру, нацыянальную па форме і пролетарскую па зьместу.

Для БССР, як нацыянальнай рэспублікі, ёсьць шмат цікавага на выстаўцы ўсеукраінскага друку і наша прапанова—зараз-жа організаваць экскурсію на гэтую выстаўку.

П. Саковіч.

Харкаў, 23-6-30 г.

ПРАВІЛЫ

прыёму ў Віцебскі Дзяржаўны Коопэрацыйны Тэхнікум на 1930-31 навучальны год

Віцебскі коопэрацыйны тэхнікум у 1930-31 нав. годзе прымае як на 1-шы курс, так і на падрыхтоўчы курс, прычым на падрыхтоўчы курс прымаюцца выключна рабочыя, батракі, беднякі і колгасьнікі з ведамі 4-5 груп сямігодкі.

Для падаўшых заявы на падрыхтоўчы курс будуць вытварацца іспыты пасьля пастановы мандатнай камісіі, прычым кожны паасобку атрымае аб гэтым асабістае пасьведчаньне. Кожны павінен даставіць у тэхнікум свой дакладны адрас. Колькасьць і характар дакумантаў для залічэньня на падрыхтоўчы курс аднолькава з паступаючым на 1-шы курс.

1. Коопэрацыйны тэхнікум рыхтуе працаўнікоў коопэрацыйных сыстэм: інструктароў, бухгальтэраў, плянавікоў-статыстыкаў і г. д.

2. Тэхнікум мае тры аддзяленьні: сельска-гаспадарчай коопэрацыі, спажывецкай коопэрацыі і аддзяленьне таваразнаўчае. Тэрмін навучаньня ў тэхнікуме—тры гады. Пры пераходзе на другі курс студэнты разьбіваюцца па спэцыяльнасьці. На працягу ўсяго тэрміну навучаньня студэнты адбываюць практыку. Па сканчэньні тэхнікуму студэнты накіроўваюцца на практычную працу ў коопэрацыйныя сыстэмы,

3. Прыём студэнтаў на 1-шы курс Віцебскага коопэрацыйнага тэхнікуму на 1930-31 навуч. год будзе праводзіцца з 15-VIII па 1-IX—30 г. Прымацца будуць як па камандыроўках коопэрацыйных саюзаў, таксама і без камандыровак. Перавага будзе аддавацца камандыраваным.

4. Скончыўшыя ў 1927-28, 28-29 і 29-30 г. г. 7-годку, школу ўзвышанага тыпу прымаюцца бяз іспытаў.

5. Асобы з практычным коопэрацыйным стажам могуць быць прыняты з ведамі да 6 груп сямігодкі. Узрост паступаючага павінен быць ня ніжэй 17-18 год.

6. Іспыты вытвараюцца з 15-25 жніўня па наступных прадметах: матэматыцы, грамадазнаўству, прыродазнаўству, фізыцы і белмове.

7. Прыём заяў з 10 ліпеня па 15 жніўня 1930 году. Да заяў абавязкова павінны быць далучаны наступныя дакуманты:

а) дакумант аб узросьце (мэтрыка)

б) дакумант аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын);

в) дакумант аб асьвеце;

г) дзьве фотографічныя картхі;

д) мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароўя;

е) дакумант, які сьведчыць аб соцыяльным і матар'яльным стане паступаючага і яго бацькоў пасьля рэволюцыі;

ж) даведка аб тым, што не пазбаўлен выбарчых праў;

з) для сялян акладны ліст, альбо пасьведчаная копія з яго па с. г. падатку на 1929-30 г., а для саматужнікаў—адпаведны дакумант аб падатку на 1929-30 год;

і) анкета, завераная профэсыйнымі, або савецкімі організацыямі.

Да заявы неабходна прыкласьці паштовыя маркі на 40 кап. для адказу, выкліку і адсылкі дакумантаў у выпадку незалічэньня.

Дакуманты трэба прадстаўляць толькі ў орыгіналах.

Заявы з дакумантамі шлеце па адрасу: г. Віцебск, вул. Талстога, 3. Дзяржаўны Коопэрацыйны Тэхнікум—прыёмнай камісіі.

Дырэктар тэхнікуму Ламдэн.

Да ведама юнкораў

У першых лічбах ліпеня Беларускае Бюро працаўнікоў Сэкцыі Друку наладжвае экскурсію газэтных працаўнікоў, рабселькораў і юнкораў тэрмінам на 5—7 дзён на Харкаўскую выстаўку друку.

Усе ўдзельнікі экскурсіі атрымаюць 50 проц. скідку на праезд па чыгунцы і дармовае агульнажыцьце. Харчаваньне —на свой кошт.

Жадаючыя ўдзельнічаць у экскурсіі павінны падаць заявы не пазьней 5 ліпеня па адрасу: Менск, Савецкая, 63, газ. „Зьвязда" тав. БУТОМАВУ.

Белбюро.

Паштовая скрынка

Вясноваму Сьміхачу—„Няма ніякага парадку", **Рабкорам**—„Да прапаноў комсамольцаў няма ніякіх рашэньняў", **Юнкору К.**—„Капыльскае начальства абараняе інтарэсы вучышчаных", **Міраноўскаму**—„Пастановы ня выконваюцца", **Вертлібу**—„Аб забойстве комсамольца Макарэнкі Сьцяпана", **Баркаўцу**—„Комсамолец у тэхнікум, а бацька з колгасу", **Найшчыку**—„Ня месца ў комсамоле і савецкай установе", **Верацяну**—„Прымаўшы, трэба разглядзець каго прымаць", Д.—Дакуль будуць ігнараваць рабселькораўскія заметкі", **Васільеву**—„У рэдакцыю „Ч. З.", і „Заметка", **М. Авяку**—„Яго благароддзьдзе", **Мятле**—„Чужды элемэнт нам ня трэба", „**Лёгкаму кавалерысту**—„Правы опортунізм на практыцы", **Гарры** — „Гора-кадры", **Комсамольцу**—„Праца ячэйкі", **Саюку**—„Полацкі АК КСМ зьвярні ўвагу", **Садоўскаму А.**—„Праявы антысэмітызму, шовінізму і хуліганства на трактарных курсах", **Інтэрнацыяналістаму**—„Неабходна ўмяшацельства РСІ", **Міланічу Міколе**—„Сыгнал з Лепельшчыны", **Вясноваму П**—„Да чаго дакаціліся", **Гафту**—„Куды глядзіць Сьмілавіцкі РК КСМ", **Пантусевічу Я.**—„Ячэйка на пароге развалу", **Жураўлю**—„Каму не дазволіў застацца", **Бярозцы**—„Ячэйка развальваецца", **Крушыне**—„Галаваціпск я адносіны", **Рашчані**—„Раней і цяпер", **Зязюльцы**—„Пяніца ня можа быць кіраўніком комсамольскай ячэйкі", **МГУ**—„Праца Зарубскай ячэйкі", **В.**—„Становішча інтэрнату Клічэўскай профтэхшколы".—Пералічаныя допісы накіраваны ў адпаведныя ўстановы для расьсьледваньня і прыняцьця належных захадаў.

Ягадку—„Пажарная крыніца", **Гаю**—„Брудная малако". **Селькору**—„Аграном ня цікавіцца", **Дражыну**—„Становішча сябра саюзу пры школе".

— Вашы допісы друкавацца ня будуць. Дробязныя факты.

Да ведама комсамольцаў і беспартыйнай моладзі, рэдакцый газэт і выдавецтва.

Агульны сход ячэйкі ЛКСМБ адбудзецца 30 чэрвеня а 8-й гадзіне ў падшэфным колгасе. Парадак дню: Даклад аб выніках XIII зьезду КП(б)Б і інш.

Збор а палове сёмай гадзіне ў рэдакцыі „Піонэр Беларусі" (Комсамольская, 25).

Адказны рэдактар Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599